ШТОМЕСЯЧНЫ
НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНЫ
ЧАСОПІС

# НАРОДНАЯ Асвета

**СТРАТЭГІЯ РАЗВІЦЦЯ**
МУЗЕЙНАЯ ПЕДАГОГІКА – СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ ДУХОЎНА-МАРАЛЬНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ АСОБЫ

**АДМІНІСТРАЦЫЙНЫ ПАРТФЕЛЬ**
ПЕДАГАГІЧНАЯ МАЙСТЭРНЯ «РЫХТУЕМ БУДУЧЫХ АЛІМПІЯДНІКАЎ»

**ПЕДАГАГІЧНАЯ АСАМБЛЕЯ**
ЛЕТНІ ПРОФІЛЬНЫ ЛАГЕР: НА ГРУНЦЕ АГУЛЬНЫХ ІНТАРЭСАЎ

**ЛЮСТЭРКА ПРАФЕСІЙНАЙ АДУКАЦЫІ**
ПІНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АГРАРНА-ТЭХНІЧНЫ КАЛЕДЖ ІМЯ А. Я. КЛЯШЧОВА

**ІНКЛЮЗІЎНАЯ ШКОЛА**
ПЯСОЧНАЯ ТЭРАПІЯ Ў КАРЭКЦЫЙНА-РАЗВІВАЮЧАЙ РАБОЦЕ

7
2023

# ГОДНАЯ АДУКАЦЫЯ – ПАСПЯХОВАЯ КАР'ЕРА

## ПРЭЗЕНТАЦЫЯ ПІНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА АГРАРНА-ТЭХНІЧНАГА КАЛЕДЖА ІМЯ А. Я. КЛЯШЧОВА
























Матэрыялы з вопыту работы Пінскага дзяржаўнага аграрна-тэхнічнага каледжа імя А. Я. Кляшчова чытайце на стар. 48–74.



Дызайн вокладкі – В. У. Краўчанка

# КРЭДА ДЫРЭКТАРА – РУХАЦЦА НАПЕРАД



*«Сэнс жыцця нашага – бесперапынны рух», – менавіта гэтыя словы Якуба Коласа лепш за ўсё адлюстроўваюць жыццёвую пазіцыю* ***Ігара Міхайлавіча Колба****, дырэктара Пінскага дзяржаўнага аграрна-тэхнічнага каледжа імя А. Я. Кляшчова.*

*Ігар Міхайлавіч у юнацтве марыў стаць афіцэрам, але лёс склаўся інакш: дзякуючы настаўніцы матэматыкі Тамары Рыгораўне Валько, якая адкрыла свайму стараннаму вучню ўсю прыгажосць царыцы навук, ён паступіў у Брэсцкі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А. С. Пушкіна на фізіка-матэматычны факультэт. Яшчэ ў час навучання І. М. Колб зрабіў першыя крокі ў прафесію – пачаў працаваць у СШ № 5 г. Брэста, а пасля атрымання дыплома вярнуўся ў сваю родную СШ № 2 г. Пінска. За вельмі кароткі час ён здолеў заваяваць аўтарытэт у калег, вучняў і іх бацькоў.*

*Педагагічны талент, мэтанакіраванасць і выдатныя арганізатарскія здольнасці маладога настаўніка аказаліся запатрабаванымі. У 1996 годзе яго прызначаюць на пасаду галоўнага спецыяліста аддзела арганізацыйна-кадравай работы Пінскага гарвыканкама, у 2000 годзе – начальніка аддзела па справах моладзі, у 2002 годзе – намесніка начальніка аддзела па адукацыі і па справах моладзі. Затым Ігар Міхайлавіч на працягу 15 гадоў узначальваў адну з лепшых устаноў адукацыі Брэсцкай вобласці – гімназію № 3 імя В. З. Каржа г. Пінска. У 2016 годзе яго абралі дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. У 2020 годзе ён скончыў Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.*

*«Рухацца наперад, не спыняцца на дасягнутым, атрымліваць новыя веды і дзяліцца назапашаным вопытам» – гэта крэда Ігара Міхайлавіча пацвярджаецца ўсім яго прафесійным жыццём. За шматгадовую плённую працу ён узнагароджаны ганаровымі граматамі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў, падзякай Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, граматамі Галоўнага ўпраўлення па адукацыі Брэсцкага аблвыканкама, Пінскага гаркама прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі. У 2014 годзе ён стаў у Пінску лепшым па прафесіі ў намінацыі «Кіраўнік установы адукацыі», а ў 2015 годзе быў удастоены ганаровага звання «Чалавек года ў галіне адукацыі».*

*З 2020 года Ігар Міхайлавіч Колб – дырэктар Пінскага дзяржаўнага аграрна-тэхнічнага каледжа імя А. Я. Кляшчова. Сваёй асноўнай задачай ён лічыць забеспячэнне прадпрыемстваў аграрна-прамысловага комплексу кваліфікаванымі спецыялістамі. Вялікую ўвагу дырэктар надае развіццю ў навучэнцаў IT-кампетэнцый, укараненню інфармацыйных тэхналогій у адукацыйны працэс, удасканаленню матэрыяльна-тэхнічнай базы, стварэнню ўмоў, якія дазваляюць як выхаванцам, так і педагагічнаму калектыву прадуктыўна працаваць і творча развівацца.*

*За апошнія тры гады каледж адзначаны ганаровымі граматамі Галоўнага ўпраўлення па адукацыі Брэсцкага аблвыканкама і Камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Брэсцкага аблвыканкама, а па выніках 2021/22 навучальнага года прызнаны лепшай установай адукацыі па арганізацыі творчай работы.*

*Ігар Міхайлавіч – чалавек разнастайных інтарэсаў. Ён прыхільнік футбола і нават мае ў сваёй скарбонцы дыпломы Міжнародных парламенцкіх гульняў і Кубка Пасольства Расіі ў Беларусі. Ёсць у яго і хобі: у рэдкія свабодныя хвіліны ён любіць парыбачыць разам са сваімі трыма сынамі.*

*«Знайдзіце сябе і пражывіце яркае, годнае жыццё», – такі наказ дае дырэктар навучэнцам каледжа. Важна не стаяць на месцы, а, пераадольваючы перашкоды, дасягаць вынікаў у вучобе, працы, жыцці – і гэта Ігар Міхайлавіч Колб паказвае на ўласным прыкладзе.*

***Падрыхтавала Л. В. Астаповіч***